| | |
|---|---|
| БЕШАНКОВІЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ | БЕШЕНКОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ |
| АДДЗЕЛ ПА АДУКАЦЫІ | ОТДЕЛ ПО ОБРАЗОВАНИЮ |
| **ЗАГАД** | **ПРИКАЗ** |

30.03.2023г.№132
г.п. Бешанковічы
Віцебская вобласць

Аб правядзенні раённага этапу рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка"

У адпаведнасці з планам работы аддзела па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама на 2023 год, на аснаванні палажэння аб правядзенні раённага этапу рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка", з мэтай павышэння цікавасці дзяцей і падлеткаў да чытання, развіцця і захавання высокіх маральных каштоўнасцяў і ідэалаў беларускага грамадства

ЗАГАДВАЮ:

1. Арганізаваць і правесці 20 красавіка 2023 года раённы этап рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка" (далей – конкурс).
2. Зацвердзіць Умовы правядзення (Дадатак 1) і склад экспертнай камісіі конкурсу (Дадатак 2).
3. Дырэктару дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі «Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі» Ючковіч А.В. забяспечыць падрыхтоўку і правядзенне конкурсу.
4. Кіраўнікам устаноў адукацыі:

4.1. забяспечыць удзел навучэнцаў і педагогаў устаноў адукацыі ў фестывалі-конкурсе;

4.2. прызначыць адказных за падрыхтоўку ўдзельнікаў у конкурсе;

5. Кантроль за выкананнем загаду ўскласці на намесніка начальніка аддзела па адукацыі А.Ц. Карбоўскую.

Начальнік аддзела М.В.Шыпуля

З загадам азнаёмлены:

А.Ц. .Карбоўская
____________
С.Я. Баранок
____________
А.А. Галавенка
____________
У.У. Гаськоў
____________
В.Л. Красакова
____________
П.М. Пясецкі
____________
Н.М. Апанасёнак
____________
А.В. Ючковіч
____________

Дадатак 1

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад начальніка
аддзела па адукацыі
Бешанковіцкага райвыканкама
30.03.2023 №

УМОВЫ
правядзення раённага этапу рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў “Жывая класіка”

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1 Арганізатарамі конкурсу з’яўляюцца: аддзел па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама, дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі “Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі”.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

Конкурс праводзіцца ў мэтах:

павышэння цікавасці дзяцей і падлеткаў да чытання;

развіцця і захавання высокіх маральных каштоўнасцяў і ідэалаў беларускага грамадства;

выхавання падрастаючага пакалення на лепшых узорах нацыянальнай літаратуры;

прыцягнення ўвагі грамадскасці да праблематыкі чытання;

пашырэння чытацкага кругагляду;

пошуку і падтрымкі таленавітай моладзі.

## 3. ПАРАДАК І УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3.1.Конкурс праводзіцца сярод вучняў наступных узроставых груп: 1-4 класы; 5-6 класы; 7-8 класы і 9-10 класы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі і ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

3.2. Конкурс праводзіцца ў тры этапы:

Першы этап праводзіцца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі;

Другі этап (раённы) праводзіцца 20 красавіка на базе ДУДА “Бешанковіцкі раённы Цэнтр дзяцей і моладзі”.

Пераможцы раённага этапу Конкурсу, заняўшыя першыя месцы ў кожнай узроставай групе, прымаюць удзел у абласным этапе Конкурсу;

Трэці этап (абласны) праводіцца ў маі ДУДА “Віцебскі абласны палац дзяцей і моладзі”.

Заяўкі на ўдзел у раённым этапе конкурсу (узор 1) неабходна выслаць да 17 красавіка 2023 года на адрас электроннай пошты: cvr_beh@mail.ru

## 4. ЖУРЫ КОНКУРСУ

4.1 У склад журы раённага этапу Конкурсу ўваходзяць прадстаўнікі аддзела па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і ўстаноў адукацыі.

4.2 Крытэрыі ацэнкі выступлення (паказчыкі-балы):

глыбіня пранікнення ў вобраз і сэнс твора- ад 0да 10
выбар тэксту твора- ад 0 да 10
артыстызм выканання ад 0 да 10
максімальны бал 30

## 5. УЗНАГАРОДЖВАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ

5.1 Сярод удзельнікаў раённага этапу конкурсу вызначаюцца пераможцы (1 месца) і прызёры (2, 3 месца) у кожнай узроставай групе, якія узнагароджваюцца дыпломамі аддзела па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама першай, другой і трэцяй ступеняў адпаведна. Раённае журы мае права прысуджаць дадатковыя прызавыя месцы.

УЗОР 1

Заяўка
на ўдзел у раённым этапе рэспубліканскага творчага конкурсу
юных чытальнікаў “Жывая класіка”

ад ДУА ________________________________________________

| № п/п | Прозвішча, імя чытальніка | Аўтар, назва твора | Клас | Установа адукацыі | кіраўнік, кантактны нумар тэлефона |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

Дадатак 2

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад начальніка аддзела
па адукацыі Бешанковіцкага
райвыканкама
30.03.2023 №

СКЛАД
журы раённага этапу
рэспубліканскага творчага
конкурсу юных чытальнікаў
“Жывая класіка”

| | |
|---|---|
| Ючковіч А.В. | дырэктар ДУДА “Бешанковіцкі РЦДіМ” |
| Грыгор’ева Н.В. | метадыст ДУ “Бешанковіцкі раённы вучэбна-метадычны кабінет” |
| Крастоўская В.А. | метадыст ДУ “Бешанковіцкі раённы вучэбна-метадычны кабінет” |
| Гаралевіч Л.В. | метадыст ДУ “Бешанковіцкі раённы вучэбна-метадычны кабінет” |
| Бучмінская Г.В. | метадыст ДУДА “Бешанковіцкі РЦДіМ” |
| Аўчыннікава В.В. | загадчык аддзела ДУДА “Бешанковіцкі РЦДіМ” |

Добавлено примечание ([ПW1]):